Мінск, 9 красавіка 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Дазвольце павіншаваць Вас з нагоды знамянальнай даты ў гісторыі нашых дзяржаў – 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Кіпр.

За гэты час нашы краіны зрабілі важныя крокі на шляху развіцця супрацоўніцтва, якія сведчаць не толькі аб даверы, але і аб зацікаўленасці ў паглыбленні сувязей і актывізацыі новых напрамкаў узаемадзеяння. Упэўнены, што больш поўнае выкарыстанне існуючага патэнцыялу беларуска-кіпрскіх стасункаў цалкам адпавядае ўзаемным інтарэсам і будзе спрыяць збліжэнню нашых краін.

Карыстаюся гэтай прыемнай нагодай, каб пажадаць моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі і поспехаў у адказнай дзяржаўнай дзейнасці Вам, Ваша Экселенцыя, дабрабыту і росквіту Рэспублікі Кіпр.

Прыміце запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей

Яго Экселенцыі
Спадару Іаанісу Касулідзісу
Міністру Замежных Спраў
Рэспублікі Кіпр
Нікасія